Тамара ЛАЗНЮХА

**Вольнай дзяржаве**

Беларусь, будзь заўжды незалежнай,
З кожным днём станавіся мацней,
Каб зайздросціць краінам замежным
Шчасцю, радасці больш, чым раней.

Ёсць усім нам чым ганарыцца:
Шмат лясоў, і азёраў, і рэк,
І празрыстай крынічнай вадзіцы,
Ад якой здаравей, чалавек.

Дзе ж так водар чаромхі і бэзу
Зачароўвае ранняй вясной?
Хай варожыя галаварэзы
Прыгажосць не парушаць вайной.

Мінск цудоўна, як волат той, вырас.
Дык давайце змагацца дружней,
Пераможам і каронавірус,
Зажывём як мага замажней.

І ніякай бядзе ці хваробе
Не скарыць тваіх мужных людзей.
Роднай мовы вышэйшая проба
Іх дарогамі праўды вядзе.

Не сагнуць дабрыню, працавітасць,
Не закрэсліць любоў да жыцця.
Гэта сцвердзяць з душою адкрытай
І дарослы, і нават дзіця.

Будзь заўжды маладой і прыгожай,
Як дзяўчына, што «кроў з малаком».
І ніхто і ніколі не зможа
Пагразіць на цябе кулаком.

Ты з'яўляешся сэрцам Еўропы,
Адпаведна таму і жыві,
Слаўся працай свайго хлебароба,
На дажынкі ў госці заві.

Хай жа сонца з блакітнага неба
Грэе нашай Айчыны прастор,
Каб заўсёды быў хлеб і да хлеба,
Гукі песень ляцелі да зор.

Заставайся навек незалежнай,
Беларусь пад буслiным крылом,
Каб зайздросціць краінам замежным
Хлебасоллю за шчодрым сталом!